Установа адукацыі
“Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна”

На правах рукапісу
УДК 37.01:37.035.6

**ШЧЭРБІН**
**Марына Міхайлаўна**

# ФАРМІРАВАННЕ ЗМЕСТУ ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМЦЫ БЕЛАРУСІ XIV–XVII стст.

**Дысертацыя на саісканне вучонай ступені**
**кандыдата педагагічных навук**
**па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі**

Навуковы кіраўнік
доктар педагагічных навук, дацэнт
Болбас В. С.

Мазыр, 2017

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ....................................................................................................3

АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ ........................................................5

ГЛАВА 1. ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ФАРМІРАВАННЯ ЗМЕСТУ ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМЦЫ БЕЛАРУСІ XIV–XVII стст. ......................................11

1.1 Змест грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў сістэме педагагічных ведаў ......................................................................................................11

1.2 Гістарыяграфія і метадалогія даследавання ..............................................25

1.3 Фактары і крыніцы фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі XIV–XVII стст. ........34

ГЛАВА 2. ТЭНДЭНЦЫІ ФАРМІРАВАННЯ ЗМЕСТУ ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМЦЫ БЕЛАРУСІ XIV–XVII стст. ........................................................................................53

2.1 Развіццё зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ва ўмовах дзяржаўна-ўтваральных працэсаў (XIV–XV стст.) .................................................53

2.2 Узбагачэнне зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання пад уплывам рэнесансна-рэфармацыйных ідэй (XVI ст.) ............................................69

2.3 Распрацоўка зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў кантэксце нацыянальна-канфесійнай палемікі (канца XVI–XVII ст.) ...............85

ЗАКЛЮЧЭННЕ ........................................................................................................108

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС ......................................................................................112

ДАДАТАК ..................................................................................................................141

# УВОДЗІНЫ

Фарміраванне трывалай грамадзянска-патрыятычнай пазіцыі індывіда адбываецца на аснове асэнсавання і ідэнтыфікацыі яго як прадстаўніка пэўнага народа і дзяржавы і з'яўляецца не толькі першачарговай задачай сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь, але і стратэгічным напрамкам існавання нашай краіны ва ўмовах глабальнай сусветнай прасторы. Парадыгмальныя ўстаноўкі сучаснай адукацыйнай сістэмы актуалізуюць вырашэнне гэтай праблемы зыходзячы з развіцця і ўдасканалення зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання на падставе гістарычнасці і нацыянальна-культурнай пераемнасці як важных прынцыпаў арганізацыі выхаваўчага працэсу. Аднак праведзены аналіз крыніц па вывучаемай праблеме сведчыць аб існаванні пэўных супярэчнасцей паміж:

- пашырэннем уплыву міжнароднага інтэграцыйнага супрацоўніцтва ў сферы адукацыі на сучасным этапе і неабходнасцю захавання нацыянальна-культурных асноў грамадзянска-патрыятычнага выхавання;
- асэнсаваннем значнасці нацыянальна-гістарычных традыцый грамадзянска-патрыятычнага выхавання і недастатковым навуковым абгрунтаваннем рэалізацыі педагагічнага патэнцыялу айчынных ідэй грамадзянска-патрыятычнага выхавання;
- актуальнасцю мадэрнізацыі выхаваўчых канцэпцый, праграм па грамадзянска-патрыятычным выхаванні і адсутнасцю даследаванняў па гісторыі педагогікі, якія б адлюстроўвалі тэндэнцыі яго развіцця ў педагагічнай спадчыне беларускіх зямель.

Распрацоўкай агульных праблем грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў сучаснай педагагічнай навуцы займаюцца як айчынныя, так і замежныя вучоныя (В.І. Бабровіч, А.Л. Барчук, В.У. Буткевіч, Л.А. Гашчанка, Т.А. Гутарчык, Н.В. Іпалітава, А.У. Русецкі, Т.А. Сезень і інш.). Многія даследаванні раскрываюць як тэарэтыка-метадалагічныя (В.Л. Жук, С.М. Захарава, У.Т. Кабуш, Ф.У. Кадол, С.С. Кацэвіч, В.В. Мартынава, В.П. Таранцей і інш.), так і метадычныя яго асновы (Л.А. Казінец, А.Ю. Крыкала, У.М. Петухоў, А.У. Талкачова і інш.).

Сярод навуковых даследаванняў, што разглядаюць сацыякультурныя аспекты фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання, варта адзначыць работы, прысвечаныя пытанням развіцця асветы і педагагічнай думкі Беларусі (С.В. Снапкоўская, Г.Р. Сянькевіч і інш.), уплыву народнай педагогікі і нацыянальна-культурных традыцый беларусаў на грамадзянска-патрыятычнае станаўленне індывіда (Г.П. Арлова, В.С. Болбас, І.І. Калачова, Л.В. Ракава і інш.). Пытанні гістарычнай абумоўленасці грамадзянска-патрыятычнага выхавання асаблівасцямі развіцця беларускіх зямель ва ўмовах станаўлення прававой сістэмы, рэлігійна-канфесійных і нацыянальных працэсаў асвятляюць

даследаванні М.І. Вішнеўскага, І.У. Вішнеўскай, Н.А. Кутузавай, І.А. Марзалюка, А.С. Майхровіча, С.А. Падокшына, В.У. Старасценкі і інш.

Важнае значэнне для дадзенай работы мелі працы расійскіх і украінскіх вучоных, у цэнтры ўвагі якіх знаходзіліся пытанні актуалізацыі здабыткаў педагагічнай спадчыны мінулага па грамадзянска-патрыятычным выхаванні ў сучасным адукацыйным працэсе (А.К. Быкава, А.М. Выршчыкава, М.Б. Кусмарцава, В.І. Лутавінава, Д.І. Пашчанкі, В.М. Прыходзька, Р.Л. Раждзественскай, А.М. Рошчына, Н.А. Сівалобавай і інш.).

Не прыніжаючы значнасці навуковых даследаванняў па разглядаемай тэме, неабходна канстатаваць, што комплекснага і мэтанакіраванага вывучэння змястоўнага складальніка ідэй грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы беларускіх зямель разглядаемага перыяда не праводзілася. Гэта прадвызначыла **праблему даследавання**: вызначэнне і тэарэтычнае абгрунтаванне развіцця змястоўнага кампанента ідэй грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі XIV–XVII стст.

Актуальнасць даследавання дэтэрмінавана на **грамадска-ідэалагічным узроўні** значнасцю выкарыстання педагагічнага патэнцыялу айчыннага вопыту па змястоўным напаўненні грамадзянска-патрыятычнага выхавання ва ўмовах развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі.

На **навукова-педагагічным узроўні** запатрабаванасць работы абумоўлена адсутнасцю сістэмных і спецыяльных даследаванняў па праблеме фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай спадчыне Беларусі.

На **асобасна-рэфлексіўным узроўні** актуальнасць дысертацыі вызначаецца патрэбай выкарыстання каштоўнасных заснаванняў зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання асобы ў працэсе яе самавызначэння з улікам пэўнай сацыякультурнай сітуацыі.

Храналагічныя рамкі даследавання ахопліваюць XIV–XVII стст.: ад канчатковага складвання тэрытарыяльнай, прававой, геапалітычнай прасторы ВКЛ да нацыянальнага, палітычнага і эканамічнага заняпаду ў складзе Рэчы Паспалітай. Вылучаны перыяд характарызуецца пераасэнсаваннем ролі асобы ў жыцці краіны, станаўленнем сістэмы грамадзянскіх абавязкаў, фарміраваннем прававой культуры, развіццём грамадзянска-патрыятычнай свядомасці пад уплывам эвалюцыі дзяржаўна-прававых і сацыякультурных працэсаў ва ўмовах нацыянальнай ідэнтыфікацыі. Гэта дазваляе вызначыць нацыянальна-культурныя адметнасці фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы XIV–XVII стст., прасачыць тэндэнцыі яго развіцця.

Актуальнасць і навуковая значнасць праблемы абумовілі выбар тэмы дысертацыі "Фарміраванне зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі XIV–XVII стст.".

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі (праектамі) і тэмамі**

Дысертацыя па сваёй тэматыцы адпавядае прыярытэтным напрамкам навуковых даследаванняў у Рэспубліцы Беларусь на 2016–2020 гг. (Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12.03.2015 г. № ДР 190 п. 11 "Грамадства і эканоміка"); распрацоўвалася ў адпаведнасці з "Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі" (№ ДР 243-З), "Праграмай бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь на 2016–2020 гг." (22.02.2016 № ДР 9), Законам Рэспублікі Беларусь "Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі" (№ ДР 65-З).

Работа выконвалася ў межах навукова-даследчых тэм "Шляхі павышэння якасці прафесійнай падрыхтоўкі будучага педагога" (кафедра педагогікі УА МДПУ імя І.П. Шамякіна ў 2013–2015 гг.); "Этнакультурныя асновы маральна-духоўнага выхавання моладзі ў Рэспубліцы Беларусь" (дагавор № ГБ 1407 ад 14.03.2014 г.).

**Мэта і задачы даследавання**

**Мэта даследавання** – абгрунтаванне тэарэтыка-метадалагічных асноў і тэндэнцый фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі XIV–XVII стст.

Дасягненне пастаўленай мэты прадугледжвае пастаноўку і вырашэнне наступных **задач**:

1. Удакладніць паняцце "змест грамадзянска-патрыятычнага выхавання", раскрыць яго характарыстыкі.

2. Вызначыць і сістэматызаваць гістарычныя фактары і ідэйна-тэарэтычныя крыніцы фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі XIV–XVII стст.

3. Абгрунтаваць перыядызацыю і ахарактарызаваць этапы фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі XIV–XVII стст.

4. Выявіць тэндэнцыі фарміравання і прагнастычны патэнцыял зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў кантэксце нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі XIV–XVII стст.

**Навуковая навізна** даследавання заключаецца ў тым, што ўпершыню:

- з пазіцый сістэмнага падыходу ўдакладнены і раскрыты сутнасныя, структурныя і функцыянальныя характарыстыкі паняцця "змест грамадзянска-патрыятычнага выхавання" як значнай катэгорыі тэарэтыка-практычных

распрацовак нацыянальнай сістэмы грамадзянска-патрыятычнага выхавання на сучасным этапе;

- вызначаны і сістэматызаваны дэтэрмінанты фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання, якія ўплывалі на характар яго эвалюцыі ў педагагічнай думцы Беларусі XIV–XVII стст.;

- абгрунтавана перыядызацыя фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі на працягу XIV–XVII стст., прадстаўлена характарыстыка яго этапаў;

- выяўлены тэндэнцыі фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў кантэксце нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі XIV–XVII стст., якія маюць важнае прагнастычнае значэнне.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

**1. Змест грамадзянска-патрыятычнага выхавання** – гэта сістэма трывалых адносін, устойліва-станоўчых поглядаў і перакананняў, грамадска-карысных рыс і якасцей асобы, заснаваных на каштоўнасным стаўленні да сваёй Радзімы, якімі павінны авалодаць выхаванцы ў адпаведнасці з пастаўленымі мэтамі фарміравання патрыёта і грамадзяніна.

*Сутнасна* ён вызначаецца накіраванасцю:

- да Радзімы-зямлі (як пэўнага тэрытарыяльна-побытавага асяроддзя);

- да Радзімы-народа (як адпаведнай этнакультурнай супольнасці);

- да Радзімы-краіны (як гістарычнай формы дзяржаўна-палітычнай жыццядзейнасці).

*Структурна* складаецца з ўзаемаабумоўленасці і пераемнасці наступных кампанентаў: рэгіянальнага (родны дом, месца нараджэння, наваколле), дзяржаўнага (тэрыторыя, улада, суверэнітэт), нацыянальнага (традыцыі, гісторыя, культура) і агульначалавечага (дабро, прыгажосць, справядлівасць).

*Функцыянальна* рэалізуецца з пазіцый: асобаснай значнасці (развіццёва-фарміруючая, індывідуалізаваная, сацыяльна-адаптаваная функцыі), грамадскай значнасці (пераемная, інтэграцыйная, камунікацыйна-ідэнтыфікацыйная функцыі), светапогляднай значнасці (гуманістычная, ідэалагічная, каштоўнасная функцыі).

**2.** Фарміраванне зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай ічнай думцы Беларусі XIV–XVII стст. было абумоўлена гістарычнымі фактарамі ўнутрыдзяржаўнага характару: *дзяржаўна-палітычныя* (тэрытарыяльнае ўмацаванне ВКЛ, афармленне структуры дзяржаўнай улады, фарміраванне саслоўна-прадстаўнічых органаў) стымулявалі выхаванне грамадскай актыўнасці і дасведчанасці сярод насельніцтва; *прававыя* (станаўленне прававой сістэмы, распрацоўка Статутаў ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг.) ініцыявалі запатрабаванасць выхавання правасвядомасці і законапаслухмянасці грамадзян; *сацыяльна-эканамічныя* (рэфармаванне землекарыстання, распаўсюджванне магдэбургскага

права, развіццё і рост гарадоў) спрыялі развіццю сацыякультурнай ідэнтыфікацыі індывіда, заахвочвалі яго імкненне да самаўдасканалення; узаемнага характару: *культурныя* (з'яўленне дзяржаўнага летапісання і кнігадрукавання на роднай мове, пашырэнне адукацыі і асветы) абуджалі выхаванне нацыянальнай свядомасці і патрыятычнага гонару асобы; *рэлігійныя* (раўнавага пазіцый праваслаўнай і каталіцкай царквы, распаўсюджванне пратэстантызму, утварэнне грэка-рымскай царквы, дзейнасць каталіцкіх і уніяцкіх ордэнаў) дэтэрмінавалі актуальнасць выхавання верацярпімасці і грамадскай згоды паміж вернікамі; знешняга характару: *ваенныя* (войны XIV–XVII стст.) садзейнічалі ўзмацненню патрыятычнай адданасці і грамадзянскага абавязку чалавека; *дагаворныя* (заключэнне Крэўскай уніі 1385 г. і Люблінскай уніі 1569 г.) дэтэрмінавалі рост грамадзянскай годнасці і ініцыятыўнасці жыхароў ВКЛ.

Важнейшымі ідэйна-тэарэтычнымі крыніцамі фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў даследуемы перыяд з'яўляюцца *народная педагагічная культура беларусаў, хрысціянская сістэма каштоўнасцей, гуманізм Рэнесансу, ідэалогія Рэфармацыі і Контррэфармацыі.*

**3. Асноўнымі этапамі фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі XIV–XVII стст.** згодна з крытэрыямі перыядызацыі (дэтэрмінацыя эвалюцыяй палітыка-ідэалагічных, нацыянальна-культурных і рэлігійна-светапоглядных працэсаў) з'яўляюцца:

I этап (XIV–XV стст.) вызначаецца *спалучэннем традыцыйных каштоўнасцей беларусаў і хрысціянскіх дабрачыннасцей* у змесце грамадзянска-патрыятычнага выхавання (абумоўлены дзяржаўным будаўніцтвам ВКЛ на прынцыпах традыцыяналізма і пераемнасці, якія актуалізавалі значнасць дзяржаўна-палітычнага адзінства і ўзмацненне прадзяржаўнай скіраванасці выхавання патрыёта і грамадзяніна);

II этап (XVI ст.) адрозніваецца *дамінаваннем нацыянальна-культурнага кантэнту* ў змесце грамадзянска-патрыятычнага выхавання (дэтэрмінаваны генезісам сацыякультурных кансалідацыйных працэсаў ва ўмовах гуманістычна-рэфармацыйнага руху і прававых пераўтварэнняў, якія абумовілі запатрабаванасць этнакультурнага самавызначэння на падставе фарміравання каштоўнаснага стаўлення да роднай мовы, культуры, гісторыі);

III этап (канец XVI–XVII ст.) характарызуецца *інтэнсіфікацыяй талерантна-канфесійных і гуманістычных ідэй* у змесце грамадзянска-патрыятычнага выхавання (абумоўлены дзяржаўна-рэлігійнымі зменамі ў складзе Рэчы Паспалітай, якія прадвызначылі акцэнтаванне ўвагі на захаванні нацыянальна-культурных адметнасцей беларусаў і падтрымцы грамадскай згоды ў полікультурным грамадстве).

**4. Тэндэнцыі фарміравання і прагнастычны патэнцыял зместу есту грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі XIV–XVII стст.:**

- узмацненне гуманістычнай накіраванасці (зацвярджэнне значнасці грамадскай рэалізацыі чалавека ў межах пэўнага сацыякультурнага асяроддзя з прыярытэтам этыка-хрысціянскіх каштоўнасцей станаўлення патрыёта і грамадзяніна);
- пераход ад грамадскай (агульнай) да асобаснай скіраванасці (асэнсаванне індывідуальнай прыроды і дзейснага характару грамадзянска-патрыятычных якасцей пры захаванні патэрналісцкіх ідэй выхавання патрыёта і грамадзяніна);
- паглыбленне нацыянальна-культурных асноў (замацаванне каштоўнаснага стаўлення да роднай мовы, культуры, гісторыі народа як падмурка выхавання патрыёта і грамадзяніна ў кантэксце развіцця полікультурнага грамадства);
- пераадоленне канфесійнай абмежаванасці фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання (падтрыманне надканфесійнага характару грамадзянска-патрыятычных якасцей з мэтай захавання грамадскай згоды);
- дапаўненне рэгіянальных (лакальна-тэрытарыяльных) дамінант фарміравання патрыёта і грамадзяніна дзяржаўна-прававымі (грамадзянскімі) ўстаноўкамі (спалучэнне традыцыяналізму і правасвядомасці ў змесце грамадзянска-патрыятычнага выхавання як значнай крыніцы захавання пераемнасці);
- рост значнасці дзяржаўна-прававой асновы фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання (абгрунтаванне неабходнасці выхавання патрыёта і грамадзяніна ў кантэксце ключавых ідэй дзяржаўнасці);

Вызначанныя тэндэнцыі фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі ў XIV–XVII стст. маюць значны прагнастычны патэнцыял. Магістральныя накірункі змястоўнага напаўнення грамадзянска-патрыятычнага выхавання знаходзяць працяг сёння ў межах рэалізацыі дзяржаўнай ідэалагічнай палітыкі Рэспублікі Беларусь праз запатрабаванасць гуманізацыі і індывідуалізацыі выхавання, неабходнасць падтрымання нацыйнальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця краіны і ўключэнне ў інтэграцыйныя глабальныя працэсы сучаснасці, значнасць выкарыстання традыцыяналізма і навацыі ў сістэме адукацыі маладога пакалення.

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Прадстаўленыя ў дысертацыі вынікі атрыманы аўтарам самастойна і заключаюцца ў раскрыцці тэарэтыка-метадалагічных асноў фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі XIV–XVII стст.; вызначэнні гістарычных фактараў і ідэйна-тэарэтычных крыніц фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі XIV–XVII стст.; абгрунтаванні перыядызацыі і характарыстыцы

этапаў фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі даследуемага перыяду; выяўленні тэндэнцый фарміравання і прагнастычнага патэнцыялу зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў кантэксце нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі XIV–XVII стст.; увядзенні ў навуковы абарот малавядомых гістарычных крыніц.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Асноўныя навуковыя палажэнні і вынікі даследавання прадстаўлены на навуковых канферэнцыях і ў зборніках навуковых артыкулаў: "Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа" (Гродна, 2009 г.); "Романовские чтения – VI" (к 75-летию исторического факультета УО "МГУ им. А.А. Кулешова") (Могилев, 2009 г.); "Беларусь і суседзі: гістарычныя шляхі, узаемадзеянне і ўзаемаўплывы" (Гомель, 2010 г.); "Аркасівські читання" (Міколаев, 2013 г.); "Актуальные проблемы социально-гуманитарных наук" (Могилев, 2013 г.); "Этнопедагогика: история и современность" (Мозырь, 2013 г.); "Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: да 900-годдзя Кірылы Тураўскага і 200-годдзя Тараса Шаўчэнкі" (Мінск, 2013 г.); "Социально-психологические проблемы современного общества и человека: пути решения" (Витебск, 2013 г.); "Православие и культура" (к 1025-летию Крещения Руси) (Гомель, 2014 г.); "Мозырщина: люди, события, время" (Мозырь, 2010, 2014, 2016 гг.); II–III "Туровские Епархиальные Образовательные чтения" (Калинковичи – Мозырь, 2015, 2016 гг.); "Святло Скарынавых ідэй: да 90-годдзя з дня нараджэння прафесара У.В. Анічэнкі" (Гомель, 2014 г.); "Менталитет славян и интеграционные процессы: история, современность, перспективы" (Гомель, 2017 г.).

Апрабацыя атрыманых вынікаў ажыццяўлялася ў працэсе абмеркавання на навукова-метадычных семінарах кафедры педагогікі УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, вучэбных занятках па спецкурсе "Развитие идей патриотизма и гражданственности в педагогической мысли Беларуси XIII–XVII вв." для студэнтаў УА МДПУ імя І.П. Шамякіна. Вынікі даследавання выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, ДУА "Гімназія г. Нароўлі", ДУА "Руднянская школа Мазырскага раёна", ДУА "Бельская базавая школа Мазырскага раёна".

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Вынікі дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 42 апублікаваных работах, сярод якіх: 7 артыкулаў у часопісах, уключаных у пералік выданняў, рэкамендаваных ВАК (у тым ліку 1 артыкул у расійскім выданні, 1 артыкул ва ўкраінскім выданні), 6 артыкулаў у зборніках навуковых прац, 28 – матэрыялы і тэзісы міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцый, 1 вучэбная праграма спецкурса для студэнтаў. Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 194 старонкі (11,32 аўт. арк.).

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, дзвюх глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса, дадатка і 4 актаў аб укараненні. Агульны аб'ём дысертацыі складае 206 старонак. Аб'ём тэкставай часткі дысертацыі – 111 старонак, з уключэннем 2 малюнкаў, 2 табліц; бібліяграфічны спіс займае 29 старонак (360 найменняў-крыніц на беларускай, рускай, украінскай і польскай мовах, у тым ліку спіс публікацый саіскальніка (42 найменні), дадатак – 61 старонка, акты аб укараненні – 5 старонак.